На досуге

# Чытаць прэстыжна

15 верасня ў Беларусі адзначаецца Дзень бібліятэк. У Гродзенскай абласной навуковай бібліятэцы імя Я.Ф.Карскага прайшоў інфармацыйны тыдзень «Чытаць прэстыжна», прымеркаваны да свята.

Дзяржаўная ўстанова культуры «Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага» – першая публічная бібліятэка на Беларусі. Рашэнне аб яе адкрыцці было прынята ў верасні 1830 года на нарадзе ў гродзенскага губернатара Міхаіла Бабяцінскага. Першапачаткова бібліятэчнай кнігай карысталася ўсяго 40 чытачоў: з іх "правасхадзіцельстваў" – 2, "высокаблагародных" – 17, "благародных" – 21. Сёння бібліятэка – гэта чатыры будынкі, у якіх змяшчаюцца розныя аддзелы, дзіцячы і юнацкі філіялы, універсальная чытальная зала. З 1997 года кіраўніком установы з'яўляецца Лідзія Васільеўна Мальцава.

10 верасня адбылося ўрачыстае адкрыццё інфармацыйнага тыдня «Чытаць прэстыжна». Прысутныя пазнаёміліся з фотадакументальнай выставай "Гродна 100 год таму...", фотаэкспазіцыяй "Позірк у мінулае. Гродна другой паловы XX стагоддзя",



паўдзельнічалі ў конкурсе знаўцаў "Таямніцы гарадзенскай гісторыі", даведаліся, якія кнігі сёння чытаюць гараджане. На наступны дзень "у госці запрасіла" «каралева польскай прозы і пакутлівай праўды», як назваў яе Францішак Багушэвіч, Эліза Ажэшка. У доміку пісьменніцы прайшла экскурсія: тут захаваліся мармуровы камін, драўляны тамбур, упрыгожаны разьбой, і балконная агароджа. Асаблівую каштоўнасць уяўляюць прыжыццёвыя творы Э.Ажэшкі, перапіска з украінскім пісьменнікам Іванам Франко, калекцыя старадаўняй мастацкай і гістарычнай літаратуры XIX-XX стагоддзяў, якая ўключае выданні Ю.Пруса, Г.Сянкевіча, Ч.Дзікенса, А.Дзюма ды іншых. Наведвальнікі прагледзелі фотагалерэю "Гродна і гарадзенцы часоў Элізы Ажэшкі", прэзентацыю выданняў для дзяцей "Незвычайныя кнігі на англійскай мове". 12 верасня адбыліся восьмыя Гарадзенскія чытанні і мультымедыйная прэзентацыя «З пачатку было Слова...: гісторыя пісьменнасці і кнігі».

***Вольга Кацько***
***Фота аўтара***